# АКТЫВІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ ЯК ФАКТАР ПАВЫШЭННЯ ЯКАСЦІ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІН САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНАГА ЦЫКЛА

*В.Л. Шыян-Фралова, С.М. Апіок*

*Вышэйшы дзяржаўны каледж сувязі, Мінск, Беларусь, rab2013@bk.ru*

Abstract. Interactive methods of education and teaching technologies, corresponding to the new aims and tasks of the curriculum are analyzed in combination with educational, research, methodological components. The influence of the information and communicational technologies implementation, innovational methods of teaching and, testing and quality control procedures are examined.

Павышэнне якасці выкладання дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла - адна з асноўных праблем сучаснай педагагічнай навукі. Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці студэнтаў - адзін з асноўных фактараў павышэння якасці выкладання.

Пры вырашэнні праблемы актывізацыі пазнавальнай дзейнасці выхад бачыцца ў павышэнні тэарэтычнага ўзроўню выкладаемага матэрыялу з паралельным азнаямленнем і навучаннем студэнтаў метадам пазнання, ўзбраення іх метадамі самастойнай працы па развіцці і набыцці інструментара пазнання.

Вывучэнне пазнавальных інтарэсаў студэнтаў настойліва патрабуе іх дыягностыкі, выяўлення агульных узроставых і спецыфічных, звязаных з індывідуальным ладам жыцця, асаблівасцей і ўзроўню развіцця інтарэсаў кожнага студэнта ў навучальным калектыве, каб нацэліць педагагічныя ўздзеянні з вялікай дакладнасцю і надзейнасцю. Гэтаму ў вядомай меры дапамагае гутарка з выкладчыкамі, куратарамі груп, бацькамі і самімі студэнтамі.

Актывізацыя вучэбнай дзейнасці - гэта працэс і вынік стымулявання актыўнасці студэнтаў. Структуру актывізацыі пазнавальнай дзейнасці можна прадставіць так:

– фарміраванне ўстойлівай матывацыі да вучэння;
– развіццё здольнасці да самарэгуляцыі паводзін у студэнта;
– ажыццяўленне рэфлексіі, самакантролю і самаацэнкі;

Па выніках ацэнкі стану актывізацыі вучэбнай дзейнасці па дысцыпліне "Эканоміка арганізацыі" у студэнтаў каледжа было выяўлена наступнае:

– большасць студэнтаў не гатовы да занятка;
– многія займаюцца без цікавасці або, наогул, не цікавяцца працай на занятку;
– студэнты выкарыстоўваюць у асноўным спосаб апярэджваючых практычных або тэарэтычных дзеянняў;
– недастаткова высокі ўзровень сфарміраванасці ведаў і ўменняў, у асноўным гэта рэпрадуктыўны ўзровень;
– слаба развіты такія якасці, як шырата мыслення;
– у студэнтаў каледжа нізкі ўзровень вучэбнай актыўнасці;

Праект актывізацыі вучэбнай дзейнасці ў студэнтаў, які заснаваны на выкарыстанні метадычна і практычна апрабаваных інтэрактыўных метадах навучання, ўяўляе сабой узаемадзеянне педагога і студэнта, комплексна ўздзейнічае на іх матывацыйную, запатрабавальную, эмацыянальную, валявую і кагнітыўную сферы асобы.

Інтэрактыўныя метады - гэта ўзмоцненае педагагічнае ўздзеянне, узаемны ўплыў удзельнікаў педагагічнага працэса праз прызму ўласнай індывідуальнасці,



Библиотека БГУИР

асабістага вопыту жыццядзейнасці. Гэта працэс інтэнсіўнай межсубъектной камунікацыі педагога і студэнтаў.

Інтэрактыўныя метады валодаюць наступнымі магчымасцямі ў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў: павышаюць ўвагу; з'яўляецца даследчая, пазнавальная дзейнасць, як адказ (рэакцыя) на натуральную і ненатуральную ва ўмовах навучання сітуацыю; асобасная актыўнасць, г.зн. праява "інтэлектуальнай ініцыятывы", узмоцненае міжсуб'ектнае ўзаемадзеянне педагога і студэнтаў; свабода выбару студэнтаў і педагога; стварэнне сітуацыі поспеху, рэфлексія.

У ходзе даследавання, пасля правядзення заняткаў з выкарыстаннем інтэрактыўных метадаў навучання, мы пераканаліся ў тым, што:

– 86,66% з цікавасцю і гатоўнасцю аднесліся да заняткаў, якія праводзіліся з выкарыстаннем інтэрактыўных метадаў навучання;

– ўзровень цікавасці да дысцыпліны павысіўся;

– гатоўнасць да заняткаў па дысцыпліне узрасла ў студэнтаў на 46,66%;

– колькасць студэнтаў з высокай вучэбнай актыўнасцю узрасла у выніку выкарыстання інтэрактыўных метадаў навучання на 53,34%;

– з захапленнем сталі працаваць на занятках па дысцыпліне "Эканоміка арганізацыі" у выніку выкарыстання інтэрактыўных метадаў навучання на 59,99% студэнтаў больш;

– знізілась колькасць студэнтаў, якія працавалі без цікавасці, і тых, якія наогул прадметам не цікавіліся, на 6,66% і 33,33 % адпаведна;

– усе студэнты на занятках задзейнічаны.

Праведзенае даследаванне не вычэрпвае ўсёй паўнаты вывучаемай праблемы. Далейшае яе даследванне можа быць прадоўжана ў напрамку даследванняў магчымасцей інтэрактыўных метадаў як фактар актывізацыі вучэбнай дзейнасці ў студэнтаў.

Выкарыстанне інтэрактыўных метадаў як сродкаў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў забяспечыла актывізацыю вучэбнай дзейнасці. Дадзеныя вынікі можна інтэрпрэтаваць на любую дысцыпліну сацыяльна-гуманітарнага цыкла, якая выкладаецца у вышэйшай школе.

***Літаратура***

1. Кашлев, С.С. Интерактивные методы развития экологической культуры учащихся: пособие для педагогов / С.С. Кашлев. – Минск: Зорны верасень, 2007. – 148 с.
2. Кашлев С.С. Интерактивные методы обучения педагогике. / С.С. Кашлев. – Мн.: «Выш. шк.», 2004. – 176с.
3. Кашлев С.С. Технология интерактивного обучения / С.С. Кашлев. – Мн.: Белорусский верасень, 2005. – 196 с.
4. Кашлев С.С. Современные технологии педагогического процесса: Пособие для педагогов. / С.С. Кашлев.– Мн.: Университетское, 2000.– 95 с.
5. 5.Коломинская, О.Я. Современные образовательные технологии /О. Я Коломинская. Мн. 2003.-100с.
6. Мельникова, Е.Л. Проблемный урок или как открывать знания с учениками/Е.Л. Мельникова. М., 2002.-205 с.
7. Лернер, И.Я. Дидактические основы методов обучения/ И.Я. Лернер. - М.: Педагогика, 1981.-186 с.
8. Соосаар, Н. Интерактивные методы преподавания/Н. Соосаар. Сн. Петербург, 2004 .- 205 с.
9. Трофимова, З.И. Игра в учебном процессе/ З. И. Трофимова. Мн., 1995. – 96 с.
10. Щукина, Г.И. Проблема познавательного интереса в педагогике/ Г.И. Щукина. - М.: Педагогика, 1971. - 352 с.
11. Якиманская, И.С. Развивающее обучение/И.С. Якиманская.-М.:Педагогика,1979.-144 с.

Библиотека БГУИР